# І Н С Т Р У К Ц Ы Я
## па складанні каляндарна-тэматычнага плана па вучэбным прадмеце, модулі /практыцы

Каляндарна-тэматычны план з'яўляецца абавязковым вучэбна-плануючым дакументам выкладчыка, які дазваляе рацыянальна вызначаць месца кожнага вучэбнага занятку ў сістэме заняткаў, забяспечвае лагічную ўзаемасувязь паміж імі, а таксама адлюстроўвае комплекс вучэбна-метадычнага забеспячэння вучэбнага прадмету, модулю/практыкі.

Добра прадуманы і якасна складзены каляндарна-тэматычны план дапамагае выкладчыку загадзя падрыхтаваць да вучэбных заняткаў неабходныя сродкі навучання, правільна спланаваць правядзенне лабараторных і практычных заняткаў.

Наяўнасць каляндарна-тэматычнага плана дае магчымасць ажыццяўляць сістэматычны кантроль за выкананнем вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце, модулі/практыцы і раўнамернай загрузкай навучэнцаў з боку вучэбнай часткі і прадметнай (цыклавой) камісіі.

Пры складанні каляндарна-тэматычнага плана на тытульным лісце ўказваецца колькасць вучэбных гадзін, прадугледжаных вучэбным планам па вучэбным прадмеце, модулі/практыцы ў семестры, а ў табліцы адлюстроўваецца сапраўдная колькасць вучэбных гадзін у адпаведнасці з раскладам вучэбных заняткаў.

Запаўненне граф 2 і 3 ажыццяўляецца пасля структурнага аналізу зместу вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце, модулі/практыцы. У гэтых графах неабходна прадугледзіць правядзенне абавязковых кантрольных работ, (кантрольных работ), практычных, лабараторных заняткаў (работ) і інш. У графе 2 паслядоўна запісваюцца назвы раздзелаў, назвы тэм вучэбнай праграмы, асобных вучэбных заняткаў.

У графе 4 указваецца тып заняткаў згодна з існуючымі класіфікацыямі (па выбары выкладчыка).

Графа 5 павінна змяшчаць абавязковы мінімум сродкаў навучання, якія неабходна выкарыстоўваць на канкрэтных вучэбных занятках (па выбары выкладчыка).

У графе 6 вызначаецца змест і аб’ём матэрыялаў для самастойнай работы навучэнцаў і для паўтарэння.

Каляндарна-тэматычны план складаецца выкладчыкам вучэбнага прадмету, модулю/практыкі на семестр, паўгоддзе або навучальны год (у залежнасці ад пачатку і працягласці навучання вучэбнаму прадмету, модулю/практыцы, але не пазней 30 жніўня (да пачатку асенне-зімовага семестра (I паўгоддзе)) і не пазней за 10 дзён да пачатку вясенняга семестра (II паўгоддзе), з якога пачынаецца абучэнне вучэбнаму прадмету, модулю/практыцы), разглядаецца прадметнай (цыклавой) камісіяй і зацвярджаецца намеснікам кіраўніка.

Калі працягласць навучання вучэбнаму прадмету, модулю/практыцы больш аднаго навучальнага года, каляндарна-тэматычны план складаецца на ўвесь аб'ём вучэбных гадзін, адведзенных вучэбным планам на вучэбны прадмет, модуль/практыку.

Усе карэктывы, якія неабходна ўнесці ў дзеючы каляндарна-тэматычны план (з улікам дасягненняў навукі, тэхнікі, тэхналогіі і інш.), павінны быць абмеркаваны прадметнай (цыклавой) камісіяй, зацверджаны намеснікам кіраўніка і пазначаны ў графе 7. Калі няма змяненняў у навучальным плане, вучэбнай праграме па вучэбным прадмеце, модулі /практыцы можна карыстацца каляндарна-тэматычным планам на працягу 3 гадоў.